## О. В. Романько, *Коричневые тени в Полесье. Белоруссия 1941-1945*, Москва 2008, 432 с.

З'яўленне дадзенай кнігі сведчыць пра тое, што цікаўнасць да праблемы нямецкай акупацыі Беларусі расце не толькі сярод заходніх даследчыкаў, але і ўсходніх (расійскіх, украінскіх). Варта прызнаць рацыі гісторыку адносна сцвярджэння пра маладаследаванасць пытанняў г.зв. беларускай калабарацыі. Ва ўступе аўтар акрэслівае свае мэты. Пасля ўважлівага азнаямлення з прадмовай можна зрабіць выснову, што аўтар імкнуўся запрэзентаваць уласнае гледзішча на складаную праблему, а таксама разбурыць шэраг дасюлешніх мітаў, якімі, безумоўна, абрасла аналізуемая праблематыка. Сам даследчык разглядае сваю працу як заахвочванне (запрашэнне) іншых даследчыкаў да далейшай навуковай дыскусіі (с. 5).

Кніга Алега Раманькі не ёсць першай навукова-папулярнай манаграфіяй, якая пабачыла свет у Расіі і ў якой асвятляюцца пытанні супрацоўніцтва беларускага насельніцтва з нямецкімі акупантамі. Варта тут узгадаць, напрыклад, працу Сяргея Чуева, асобныя раздзелы якой датычаць Беларусі[1]. Трэба аднак аддаць належнае аўтару, праца якога адрозніваецца ад папярэднікаў як абсягам аспектаў, якія закранаюцца ў даследаванні, так і непараўнальна большай колькасцю выкарыстанай літаратуры. Прыкладам, у працы гісторыка магчыма знайсці досыць рэдкія выданні беларускай эміграцыі, якія па шэрагу прычын былі недасягальныя альбо невядомыя даследчыкам з Расіі. На падставе азнаямлення са зместам працы можна заўважыць імкненне аўтара да ўзважанага і аб'ектыўнага аналізу. Невыпадкова, даследчык пазбягае „вострых" ацэнак і не надае эмацыянальнае афарбоўкі падзеям, якія апісвае. Неабходна прадкрэсліць, што аўтар з'яўляецца вядомым і аўтарытэтным даследчыкам Другой сусветнай вайны, у навуковым даробку якога знаходзяцца працы, прысвечаныя, між іншым, вайсковаму супрацоўніцтву іншых народаў СССР з III Рэйхам[2].

Кніга складаецца з абшырных уводзінаў („Замест прадмовы: калабарацыянізм і палітыка германскага кіраўніцтва ў гады другой сусветнай вайны"), чатырох раздзелаў, заключэння („Замест пасляслоўя") і дадаткаў.

Ва ўводзінах гісторык дае грунтоўную характарыстыку нацыянальнай палітыкі акупанта ў дачыненні да народаў СССР, у тым ліку да бе-

[1] С. Чуев, *Проклятые солдаты*, Москва 2004.

[2] Сярод найбольш вядомых можна пералічыць: О. Романько, *Мусульманские легионы во Второй мировой войне*, Москва 2004; A. Munoz, O. Romanko, *Hitler's White Russians: Collaboration, Extermination and Anti-Partisan Warfare in Byelorussia 1941-1944*, New York 2003.

ларускага насельніцтва. У першым раздзеле „Беларусь у гады нямецкай акупацыі (1941-1944): вайскова-палітычны погляд на праблему" асвятляецца агульная сітуацыя ў акупанавай Беларусі. Аўтар дэталёва падае агляд тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу, а таксама вайсковых і цывільных структур акупацыйнай улады. Уводзіны і першы раздзел, які выконвае ролю агульнага і мае ўвесці чытача ў праблему, дазваляе зразумець істоту нямецкай акупацыйнай палітыкі ў дачыненні да паняволеных народаў, а таксама адлюстроўвае некаторыя асаблівасці акупацыйнага рэжыму ў Беларусі.

У другім раздзеле „Беларускі нацыяналізм і яго роля ў працэсе стварэння беларускіх калабарацыйных фармаванняў" гісторык засяродзіў увагу на гісторыі беларускага нацыянальнага руху, дзе намагаецца падкрэсліць яго неаднародны палітычны склад. Асобнае месца займае пытанне супрацоўніцтва беларускіх дзеячаў з нямецкімі акупацыйнымі ўстановамі. У сувязі з гэтым А. Раманька апісвае дзейнасць такіх арганізацый, як Беларуская народная самапомач, Беларуская рада даверу, Беларуская цэнтральная рада, Саюз беларускай моладзі. Апрача таго, аўтар прадстаўляе становішча антынямецкага руху супраціву: польскае ўзброенае падполле, савецкая партызанка, украінскія нацыянальныя сілы, што дазваляе ўявіць якім полем змагання за ўплывы стаўся абшар акупаванай Беларусі.

Нягледзячы на досыць агульную назву манаграфіі, са зместу вынікае, што даследчык не хавае свайго жадання засяродзіцца на гісторыі беларускіх вайсковых фармаванняў пад нямецкім камандаваннем у гады Другой сусветнай вайны. Такім чынам два наступныя раздзелы даследавання непасрэдна прысвечаны менавіта гэтай праблеме. Раздзел трэці „Беларускія калабарацыйныя фармаванні на тэрыторыі Беларусі (1941-1944): Арганізацыя і баявое выкарыстанне" распавядае пра гісторыю стварэння і дзейнасці вайскова-паліцыйных фармаванняў да моманту заняцця Беларусі Чырвонай Арміяй улетку 1944 г. Раздзел чацвёрты „Беларускія калабарацыйныя фармаванні на эміграцыі (1944-1945): Арганізацыя і баявое выкарыстанне") прысвечыны фармаванням, якія былі створаны ў пазнейшы час.

У дадзенай рэцэнзіі мы засяродзімся на найбольш спрэчных момантах і недахопах, якіх аднак не пазбаўлена рэцэнзаваная праца. Калі першы раздзел не выклікае вялікай дыскусіі, то наступныя часткі працы, як нам здаецца, будуць прадметам больш грунтоўнага абмеркавання. У прыватнасці, у другім раздзеле гісторык закранае праблему антынямецкага руху супраціву (у тым ліку партызанку), кіраванага беларускімі нацыяналістамі. Да спробаў стварэння і дзейнасці гэтага руху аўтар залічвае: Партыю беларускіх нацыяналістаў (ПБН), Беларускую народную грамаду (БНГ), Беларускую незалежніцкую партыю (БНП), Бела-

рускую народную партызанку. Як вядома, у дадзены момант пры разглядзе гэтага пытання ў дасюлешняй гістарыягафіі мы маем дачыненне з двума цалкам дыяметральнымі пунктамі гледжання на існаванне беларускага ўзброенага руху супраціву падчас Другой сусветнай вайны і ў паваенныя гады. Не ўваходзячы ў сутнасць справы адзначым толькі, што розніца заключаецца ў адказе на пытанне: існаваў дадзены партызанскі рух ці не? Аўтар кнігі згаджаецца з першым поглядам, але зусім не піша якім чынам ён зрабіў свае высновы. Па сутнасці пры адсутнасці архіўных крыніц аўтар некрытычна цытуе сваіх беларускіх калег, але не ўносіць нічога новага ў разгляд, запамятаўшы, што пытанне беларускага нацыянальнага антысавецкага і антынямецкага супраціву з'яўляецца дасюль прадметам актыўнай дыскусіі. У сувязі з гэтым разгляд дадзенай праблемы выглядае „аднабокім". А нагадаем, што праблема генезісу (БНП), а нават існавання (ПБН, БНГ, БНПартызанка) вышэйзгаданых структур, з'яўляецца прадметам жывой дыскусіі і мае шмат пытанняў, якія патрабуюць грунтоўнага адказу. Яшчэ ў большай ступені датычыць гэта бачання аўтарам паваеннага супраціву (Беларуская вызвольная армія „Чорны Кот"). Узгадваючы пра гэты эпізод, гісторык, абапіраючыся выключна на даныя, якія паходзяць з энцыклапедычнага даведніка, робіць далёкаідучыя высновы (с. 258-259).

Увагі заслугоўвае, таксама, падраздзел „Беларускі нацыяналізм: рэтраспектыва" другога раздзела, у якім аўтар імкнецца абмаляваць стан беларускага нацыянальнага руху напярэдадні Другой сусветнай вайны. Пачатак беларускага нацыяналізму аўтар прасочвае ад паўстання 1863 г. Цікаўнасць тут выклікае тое, што пры падрыхтоўцы дадзенага падраздзела даследчык спасылаецца на зборы Федэральнага вайсковага архіва ў Фрайбургу. Гэты факт не можа не паўстрымаць уважлівага чытача ад пытання: якія дакументы і матэрыялы могуць захоўвацца ў фрайбургскім архіве, якія тычацца такіх перыядаў беларускай гісторыі, як паўстанне 1863 г.? Аказваецца, у сапраўднасці ў якасці адной з асноўных крыніц аўтар выкарыстоўвае публікацыю аўтарства Івана Карынкевіча „Беларускі сепаратызм" (с. 52-69), якая была змешчана ў часопісе расійскіх паваенных эмігрантаў „Часовой"[3]. Пры ўсёй пашане да аўтарытэту аўтара згаданай публікацыі нічым нельга абгрунтаваць выбару дадзенай крыніцы ў якасці падставы для падрыхтоўкі фрагмента, прысвечанага гісторыі беларускага нацыянальнага руху. Сам характар выдання сведчыць пра тое, што гэну публікацыю належыць залічыць да літаратуры публіцыстычнага кшталту. Публікацыя, на якую

[3] Аўтар кнігі спасылаецца на зборы Федэральнага вайсковага архіва ў Фрайбургу, паколькі асобнік газеты «Часовой» знаходзіцца ў адным з фондаў гэтай установы (Зборы Уладзіміра Пазнякова).

спасылаецца А. Раманька, з'яўляецца красамоўным прыкладам палітычных сварак і рознагалоссяў сярод паваеннага антысавецкага лагера на чужыне. У святле сучаснага стану гістарыяграфіі праблемы выкарыстанне дадзенай публікацыі ў якасці крыніцы па гісторыі Беларусі канца XIX — пачатку XX ст. належыць разглядаць як выкладанне ў найлепшым выпадку надзвычай спрошчанай і некрытычнай версіі гістарычных працэсаў.

Як ужо адзначалася раней, аўтар у сваім даследаванні шмат увагі прысвяціў беларускім вайсковым фармаванням пад нямецкім камандаваннем. У сувязі з гэтым варта звярнуць увагу на некаторыя недакладнасці, якія тычацца гэтае праблемы. Уважлівы чытач можа без цяжкасці заўважыць, часамі, празмерны давер да мемуарнай літаратуры і ўспамінаў, да якіх досыць часта звяртаецца даследчык. Прыкладам можа быць аповед пра „Навааградскі (беларускі) эскадрон Барыса Рагулі". Ідучы за многімі сваімі папярэднікамі, А. Раманька пераканaны, што гэтае фармаванне накшталт „самаахoвы" было створана са згоды наваградскага гэбітскамісара Вільгельма Траўба, якое потым было пераформавана ў батальён Беларускай краёвай абароны. Гэтая версія не адпавядае рэчаіснасці. З архіўных крыніц вынікае, што Б. Рагуля згодна з загадам Курта фон Готберга ад 22 лютага 1944 г. быў прызначаны камандзірам шума-батальёна (кавалерыйскага шума-аддзела), які з сакавіка 1944 г. афіцыйна выступаў як 68-ы беларускі шума-батальён. Прытым гэты батальён ніколі не быў часткай БКА, а са жніўня 1944 г. быў уключаны ў склад брыгады/дывізіі Ганса Зіглінга[4]. Памылковыя звесткі пра існаванне і дзейнасць „Наваградскага швадрона" альбо „Беларускага наваградскага швадрона" паходзяць з эміграцыйных крыніц. Перад усім такую версію распаўсюджваў сам Б. Рагуля і ягоныя паплечнікі, каб такім чынам падкрэсліць сваю самастойнасць у гады акупацыі і ўмацаваць уласны аўтарытэт сярод суродзічаў на чужыне. А. Раманька ў гэтым выпадку аказаўся не ў стане разблытаць гэтай гісторыі і тым самым запрэзентаваў памылковую эміграцыйную версію.

Аўтар піша, што на Беларусі было сфармавана 11 шума-батальёнаў — батальёнаў дапаможнай паліцыі (с. 161-162, 320). З гэтай тэзай нельга цалкам пагадзіцца, паколькі існуюць крыніцы, якія сведчаць пра наяўнасць 12 беларускіх шума-батальёнаў. Галоўным чынам розніца вынікае з адсутнасці ў падліках А. Раманькі вышэйзгаданага 68-га батальёна Б. Рагулі і 48-га запасовага шума-батальёна (не блытаць з 48-м палёвым шума-батальёнам, пра які згадвае даследчык). Апрача таго, 69-ы (конны) шума-батальён не быў беларускім, паколькі складаўся з каза-

[4] Ю. Грыбоўскі, *Наваградскі эскадрон Бырысы Рагулі: вядомае і невядомае*, „Białoruskie Zeszyty Historyczne", 2008, z. 30, s. 101-114.

каў. Гэтае фармаванне мела дачыненне да Беларусі толькі ў тым сэнсе, што было сфармавана ў Наваградку ў сакавіку 1944 г. Дарэчы, да сумніўных належыць залічыць сцвярджэнне аўтара пра прысутнасць на Беларусі шума-батальёнаў толькі двух тыпаў — вартавых і палявых (с. 161), тым часам, як у ліпені 1942 г. у Менску быў створаны 48-ы запасовы шума-батальён (расфармаваны ў сакавіку 1943 г.)[5].

Аўтар адзначае, што ў склад 30-й грэнадзёрскай дывізіі СС (2-й расійскай) уваходзілі беларускія, украінскія і расійскія паліцыйныя аддзелы, але не згадвае пра 34-ы і 23-ці пяхотныя батальёны БКА, якія апынуліся ў складзе адпаведна 1-га і 4-га палкоў дывізіі[6].

Не знаходзіць пацвярджэння ў крыніцах сцвярджэнне адносна існавання пры СБМ добраахвотнага юначага корпуса пад патранатам БКА і добраахвотнай дапаможнай жаночай службы БКА (с. 202). Праўдападобна, даследчык зачарпнуў гэтыя звесткі з альбома Уладзіміра Шнэка. Але ў гэтым выпадку даводзіцца казаць ужо пра паваенныя праекты (1984 г.), а не пра фактычны стан у гады існавання СБМ і БКА. У кнізе згадваецца вучэбны лагер <u>Мульта</u> ў Нямеччыне, у які ў чэрвені 1944 г. трапілі сябры СБМ (с. 212). Насамрэч відавочна гаворка ішла пра лагер для выхаванцаў СС у мясцовасці Мальта, які быў размешчаны на тэрыторыі далучанай да III Рэйха Аўстрыі[7].

Насуперак меркаванню аўтара „беларуская рота лейтэнанта СД пад камандаваннем С. Бобкі" не была самастойнай адзінкай пры Баранавіцкім СД (с. 179), а з'яўлялася 7-й ротай 13-га (беларускага) батальёна дапаможнай паліцыі СД. Сведчаць пра гэта як архіўныя дакументы, так і даследаванні[8]. Аўтар не ўдакладнае адкуль ён узяў назву гэнае адзінкі *Weissruthenische-Polizei (SD)-Bataillon nr 13* (с. 173), бо з літаратуры прадмета вынікае, што ў сапраўднасці батальён насіў назву *Schutzmannschafts Bataillon der SD 13*[9]. Немагчыма пагадзіцца з тым, што ў 13-м батальёне ў якасці элементаў уніформы выкарыстоўваліся цэшкі з выявай „Пагоні" (с. 172). Вядома, што функцыянеры гэтага фармавання ўжывалі цэшкі СС. Адзіным нацыянальным элементам ва ўніформе жаўнераў гэтага батальёна была нарукаўная адзнака.

Досыць дыскусійна выглядае тэза аўтара пра планы і намеры камандавання БКА адносна стварэння з цягам часу такіх радоў зброі, як тан-

[5] J. Gdański, *Zapomniani żołnierze Hitlera*, Warszawa 2005, s. 248.

[6] Шырэй: Ю. Грыбоўскі, *Беларускі легіён СС: міфы і рэчаіснасць*, „Беларускі гістарычны агляд", 2007, т. 14, сш. 1-2 (26-27), с. 97-140.

[7] Шырэй: Ю. Туронак, *Людзі СБМ*, Смаленск 2006.

[8] A. Galiński, *Eksterminacja inteligencji polskiej latem 1942 r w województwie nowogródzkim (problemy badawcze)*, „Biuletyn Głównej Komisji Badania Zbrodni przeciwko Narodowi Polskiemu Instytutu Pamięci Narodowej", 1991, t. 33.

[9] J. Gdański, *Zapomniani żołnierze Hitlera*, s. 144-145.

кавыя войскі, артылерыя, парашутныя часткі, марская пяхота, азёрнарачная флатылія і г.д. (с. 233). Тым больш, што даследчык у дадзеным месцы не падае крыніцы. У вядомай дасюль гістарыягафіі мы не трапляем на згадкі такога кшталту.

Выклікае дыскусію сцвярджэнне пра скіраванне ўвесну 1945 г. пэўнай часткі жаўнераў-беларусаў у склад Ягдкаманды пры 38-й дывізіі СС „Нібелунгі" (с. 277, 319). У рэчаіснасці туды трапілі толькі немцы, тым часам беларускі персанал часова лічыўся „звольненым". У гэтым месцы варта дадаць, што 30 красавіка 1945 г. у амерыканскі палон здаліся па сутнасці былыя жаўнеры дывізіі, паколькі на той час яна ўжо лічылася расфармаванай (загад аб ейным расфармаванні быў выдадзены паміж 15 і 20 красавіка)[10].

Варта заўважыць, што даследчык вельмі падрабязна апісвае дасюль мала вядомы эпізод вайсковасці, як дзейнасць 30-й грэнадзёрскай дывізіі СС (2-й расійскай), сярод асабовага складу якой пераважалі былыя шутцманы-беларусы. Аўтар крок па кроку прадстаўляе этапы ейнай рэарганізацыі, удзел у баявых дзеяннях у Францыі, настроі вайскоўцаў, а таксама нацыянальны склад. Разам з тым неабходна звярнуць увагу на пэўныя дыскусійныя моманты. З тэксту не зусім зразумела, дзе дайшло да антынямецкага рокашу вайскоўцаў ненямецкага паходжання. А. Раманька піша, што ў першай палове жніўня 1944 г. камандаванне выдала загад аб скіраванні дывізіі на фронт у Францыю і да канца гэтага ж месяца апошнія падраздзелы дывізіі апынуліся ў Францыі. Тым часам аўтар даводзіць, што 27 жніўня 1944 г. яшчэ на тэрыторыі Польшчы жаўнеры 2-га батальёна 1-га палка і 1-га батальёна 2-га палка ўзнялі бунт і забілі сваіх нямецкіх камандзіраў (с. 272-273). Але на падставе вядомых нам архіўных крыніц і даследаванняў можна меркаваць, што згаданая акцыя мела месца на тэрыторыі Францыі[11]. Тым больш, што ў іншым месцы гісторык сам згадвае пра масавы пераход уначы з 26 на 27 жніўня 1944 г. на бок французскіх партызан 2-га батальёна 76-га палка. У сувязі з гэтым мімаволі ўзнікае пытанне ці гаворка ідзе пра адну і тую ж падзею. Незалежна ад усяго, у апошнім выпадку не зусім зразумела, у якім падраздзеле адбыўся пераход, бо згадваючы пра жнівеньскія падзеі трохі раней аўтар піша пра тое, што нумарацыя, якая прадугледжвала існаванне 76-га грэнадзёрскага палка, была ўведзена ў дывізіі толькі ў кастрычніку 1944 г. (с. 268). Сярод асноўных прычын нізкага баявога духу асабовага скла-

[10] J. Grzybowski, *Białoruskie formacje zbrojne w służbie niemieckiej podczas II wojny światowej*, „Przegląd Historyczno-Wojskowy", 2008, nr 2, s. 117.

[11] Л. Рэйн, *Недачалавекі ўва уніформе СС: 30-я вафэр-грэнадзёрская дывізія Вафэн СС*, „Arche", 2008, № 5, с. 479-480.

ду дывізіі і масавых дэзерцыяў А. Раманька згадвае той чыннік, што немцы вырашылі перакінуць фармаванне на заходні фронт, што было спрэчна з жаданнем усходняга персаналу дывізіі змагацца супраць саветаў, а не супраць заходніх хаўруснікаў, а таксама праблемы, якія вынікалі са шматнацыянальнага складу адзінкі і кепскага трактавання нямецкімі камандзірамі сваіх славянскіх падначаленых. Неабходна аднак дадаць, што дэзерцыя, асабліва на тэрыторыі Польшчы, у значнай ступені была звязана з дзейнасцю польскага незалежніцкага падполля, аб чым сведчаць масавыя і сістэматычныя пераходы жаўнераў дывізіі на бок партызан. Пад уплывам гэтых здарэнняў нямецкае камандаванне было вымушана нават адклікаць выдадзены раней загад аб скіраванні дывізіі на падаўленне Варшаўскага паўстання.

Шкада, што аўтар амаль не згадвае пра вайскова-паліцыйныя фармаванні, якія існавалі ў 1941-1944 гг. па-за межамі Беларусі (Беластоцкая акруга, Італія) і якія складаліся з беларусаў. Гісторык грунтоўна і дэталёва апісаў дзейнасць СБМ, але па-за яго ўвагай засталася яшчэ адна маладзёвая ваенізаваная арганізацыя — Беларуская служба бацькаўшчыне (БСБ).

Аўтар робіць спробу падлічыць прыблізную колькасць беларусаў у шэрагах нямецкіх вайскова-паліцыйных адзінак. На думку А. Раманькі, у шэрагах нямецкіх узброеных сіл служыла да 50 тыс. беларускіх добраахвотнікаў (с. 286-287). Выпадае не згадзіцца з дадзеным тэрмінам. Безумоўна, вайскова-паліцыйныя адзінкі лічыліся добраахвотнымі, але большасць людзей, якія ў іх служылі, складалі аднак тыя, хто апынуўся ў войску альбо паліцыі шляхам прымусовага закліку. У першую чаргу датычыць гэта жаўнераў БКА, але ў Беларускай Самаахове і шума-паліцыі мабілізацыя, таксама, была распаўсюджаний з'явай.

Каментарыя патрабуе спіс крыніц і бібліяграфіі, на падставе якой была падрыхтавана праца. Даследчык выкарыстаў дакументы з архіваў Нямеччыны (Федэральны вайсковы архіў), Расіі (Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі), Украіны (Дзяржаўны архіў Аўтаномнай Рэспублікі Крым) і Беларусі (Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь). Апрача таго на асобную ўвагу заслугоўвае тое, што аўтару ўдалося выкарыстаць прыватны архіў Ёахіма Гофмана, вядомага нямецкага даследчыка Другой сусветнай вайны. З аналізу выкарыстанай літаратуры вынікае, што аўтар выкарыстаў працы расійскіх, польскіх, украінскіх, нямецкіх, англійскіх і амерыканскіх гісторыкаў. Складана прыгадаць ранейшае даследаванне, прысвечанае акупацыі Беларусі, у якім быў бы задзейнічаны такі значны масіў заходняй і расійскай літаратуры. Дзякуючы рэцэнзаванай працы гэта стала магчыма. Ніякім чынам не абніжаючы вартасці і якасці падбору заходняй і расійскай літаратуры прадмета, кідаюцца аднак у вочы пэўныя заганы ў выкарыстанні бела-

рускай гістраяграфіі. На падставе аналізу выкарыстанай літаратуры магчыма заўважыць, што гісторык старанна адсочваў таксама беларускія публікацыі, у тым ліку апошніх гадоў. У значнай ступені гэта працы ў акрэсленых выданнях, такіх як „Беларускі гістарычны агляд", „Запісы", „Беларускі рэзыстанс", а таксама ў перыядычным друку. Зразумела, што складана адсачыць цалкам усё, што тычыцца дадзенага пытання, асабліва калі гаворка ідзе наконт замежнае гістарыяграфіі, якой, несумненна, з'яўляецца беларуская ў дачыненні да аўтара разгляданай працы. Разам з тым, па-за ўвагай гісторыка апынуўся цэлы шэраг публікацый, якія магчыма залічыць у лік надзвычай істотных набыткаў беларускай гістарыяграфіі па праблеме нямецкай акупацыі Беларусі. У прыватнасці, аўтар кнігі згадвае ўсяго чатыры працы вядомага гісторыка Юрыя Туронка, тым часам як апошні мае непараўнальна большую колькасць грунтоўных даследаванняў, якія заслугоўваюць несумненнай увагі. Прыкладам, аўтар манаграфіі не ўлічыў такія працы даследчыка, як „Беларуская кніга пад нямецкім кантролем" і апошнюю працу гісторыка „Людзі СБМ". Не знаходзім у спісе выкарыстанай літаратуры і працу Ігара Валахановіча пра антысавецкае ўзброенае падполле ў Беларусі ў 1944-1953 гг. Асабліва незразумелым з'яўляецца тое, што аўтар практычна не выкарыстаў прац бадай найвядомага на сённяшні дзень даследчыка беларускай калабарацыі Аляксея Літвіна. У спісе бібліяграфіі магчыма адшукаць толькі адзін дробны артыкул гэтага аўтара, апублікаваны ў газеце „Наша Ніва". Тым часам як шматгадовы навуковы даробак А. Літвіна па дадзенай праблеме цяжка недаацаніць, а тым больш не заўважыць[12]. У сваёй кнізе А. Раманька спасылаецца на даследаванні Сяргея Ярша, але разам з тым няма нават згадкі пра працу „Беларускі супраціў" (дарэчы, гэта кніга выйшла ва Украіне). Прыкра, але фактам ёсць тое, што ў спісе літаратуры няма і яшчэ адной пазіцыі, якую нельга абмінуць увагай даследчыку беларускай калабарацыі, а менавіта кнігі Івана Касяка і Язэпа Найдзюка „Беларусь учора й сяньня". Адсутнічае ў спісе збор дакументаў „За дзяржаўную незалежнасьць Беларусі", які пабачыў свет у Лондане ў 1960 г., а таксама „ўспаміны" Канстанціна Езавітава (фактычна гэта сведчанні, атрыманыя ў часе допытаў у МДБ).

Увогуле, аналізуючы спіс выкарыстанай літаратуры можна сцвердзіць, што ў шэрагу выпадках бібліяграфічнаму апарату ўласціва пэўная неахайнасць і недакладнасць. Як у тэксце, гэтак і ў бібліяграфіі,

[12] Да найбольш значных навуковых публікацый А. Літвіна належаць, між іншым: *Акупацыя Беларусі: пытанні супраціву і калабарацыі*, Мінск 2000; *Беларуская Самаахова*, [у:] *Старонкі ваеннай гісторыі Беларусі*, 1998, № 2; *Местная вспомогательная полиция на территории Беларуси (июль 1941— июнь 1944 гг.)*, [у:] *Беларусь у XX стагоддзі*, вып. 2, Мінск 2003, с. 212-227.

гісторык падае памылковы год выдання кнігі Францішка Кушаля „Спробы стварэньня беларускага войска” — 1989, тым часам, вядома, што згаданая кніга выйшла дзесяць гадоў пазней. Дзве вядомыя публікацыі Ю. Туронка, апублікаваныя ў „Беларускім гістарычным агладзе” аўтар несвядома прыпісаў часопісу „Беларускі рэзыстанс” (с. 393). Аўтар спасылаецца на фрагмент успамінаў Дзмітрыя Касмовіча, якія былі змешчаныя ў часопісе „Спадчына” (2003, № 6), але вядома, што пазней выйшла асобная кніга ўспамінаў гэнага дзеяча.

Пытанні выклікае і раздзел, які аўтар манаграфіі затытулаваў „Асабісты архіў Алега В. Раманька”. Сярод пяці дакументаў, якія паводле аўтара знаходзяцца ў яго ўласным архіве, існаванне, прынамсі, аднаго магчыма паставіць пад сумненне. А менавіта гаворка ідзе пра публікацыю Ю. Грыбоўскага „Польска-беларускі канфлікт у Генеральнай акрузе „Беларусь” (1941-1944 гг.), 2005”. Мяркуючы па нумарацыі старонак, якія падае аўтар, магчыма сцвердзіць, што маецца на ўвазе артыкул пад вышэйзгаданай назвай, які ў рэчаіснасці быў надрукаваны ў „Беларускім гістарычным зборніку” (2006, № 25), але ніякім чынам гэта не рукапіс, які захоўваецца ў зборах аўтара.

Завяршаючы агляд бібліяграфіі можна звярнуць увагу на тое, што менш значнымі, але патрабуючымі выпраўлення падчас магчымых наступных выданняў, падаюцца тэхнічныя агрэхі — недакладнасці ў напісанні некаторых прозвішчаў (К. Романовіч замест К. Рамановіч, Л. Юревіч замест Л. Юрэвіч) і датах (у кнізе дата смерці Аўгена Калубовіча — 1943 год) (с. 341). Вядома, у дадзеным выпадку заўвагі трэба кіраваць пад адрасам рэдактара.

Кніга А. Раманькі мае вялікі дадатак, які складаецца са статыстычных даных, цікавых архіўных дакументаў, пайменных спісаў і г.д. Многія з дадаткаў падкрэсліваюць руплівы высілак складальніка. Праўда, шкада, што даследчык не падае пры шматлікіх табліцах крыніц. Некаторыя моманты належыць удакладніць. Так, аўтар нічога не кажа наконт смерці першага віцэ-прэзідэнта БЦР Мікалая Шкялёнка, зазначаючы толькі, што з 1944 г. ён апынуўся ў Нямеччыне. Гісторык дарэмна бярэ пад увагу версію (хоць і зазначае, што яна малаверагодная) адносна расстрэлу ў Марселі польскай контрвыведкай беларускага дзеяча Рыгора Зыбайлы (с. 341). У дадзены момант вяртанне гэтага чалавека пасля вайны ў БССР не падлягае сумніву. Аўтар падае афіцэрскі склад 13-га батальёна СД на падставе аналізу ўспамінаў Ф. Кушаля і гэта выклікае пэўныя нязгоднасці ў жыццяпісе некаторых вайскоўцаў.

Належыць адзначыць, што слабым месцам кнігі з’яўляецца ўкладка з малюнкамі і здымкамі. Цалкам зразумела імкненне аўтара да надання сваёй працы больш даступнага зместу не толькі навукоўцам, але і звычайным чытачам (тым больш, што кніга заяўлена як навукова-па-

пулярнае выданне), але варта пагадзіцца з тым, што гэтая частка кнігі пакідае быць нашмат лепшай. Трэба падкрэсліць, што аўтар не вылучыўся арыгінальнасцю, калі змесціў у сваёй працы выявы вайскоўцаў (Кастусь Езавітаў, Іван Гелда, Франц Кушаль, Усевалад Родзька), запазычаныя з маляваных кішэнных каляндарыкаў (2001) альбо партрэты з расійскай і беларускай літаратуры. Дадзенае спалучэнне мела б аднак нейкі сэнс у тым выпадку, калі б ілюстрацыі былі поўнакаляровыя і адлюстроўвалі пэўныя элементы абмундзіравання. Што тычыцца магчымага жадання аўтара паказаць такім чынам канкрэтныя гістарычныя постаці, то ў такім разе мэтазгодней было б звярнуцца да агульнавядомых фотаздымкаў вышэйзгаданых асобаў. Магчыма, што фармат кнігі не адпавядаў такому запатрабаванню.

У подпісах пад здымкамі, таксама, магчыма заўважыць пэўную неадпаведнасць. Так, мяркуючы па некаторых элементах абмундзіравання выглядае вельмі сумніўна тое, што на адным са здымкаў прадстаўлены жаўнеры БКА. Відаць мае рацыю Ю. Туронак, які лічыць, што гэта функцыянеры дапаможнай паліцыі на Меншчыне[13]. Аўтар падае элементы абмундзіравання БКА, запазычаныя з альбома Уладзіміра Шнэка і адзначае, што гэта „ўніформа засталася на ўзроўні праекту, паколькі ва ўмовах вайны ейны пашыў аказаўся неажыццявімым. Выкарыстоўваліся толькі некаторыя знакі адрознення”. Падаецца, што дадзены каментарый не зусім пасуе да апісання сітуацыі, паколькі можа ўвесці ў зман чытача. З гэтага вынікае, што нібы дадзены праект ужо існаваў у гады вайны. Насамрэч адсутнічаюць звесткі, якія б сведчылі пра існаванне распрацовак у ваенны перыяд, а ёсць усе падставы меркаваць, што гэны праект быў апрацаваны сябрам Беларускага вызвольнага фронту (БВФ) Ул. Шнэкам толькі ў 1984 г. у Аўстраліі ў 40-я ўгодкі стварэння БКА. Беларускі эмігрант сапраўды запазычыў шэраг элементаў абмундзіравання, якія былі апрацаваныя ў 1944-1945 гг., але ў пераважнай большасці прадстаўленыя малюнкі ўяўляюць сабой аўтарскі праект, які паўстаў сорак гадоў пасля заканчэння Другой сусветнай вайны.

Ацэньваючы фактаалагічны змест кнігі належыць адмеціць, што праца А. Раманькі перад усім можа мець істотнае значэнне для расійскай аўдыторыі, у якой дасюль існуюць нешматлікія публікацыі, прысвечаныя толькі паасобным эпізодам гэтае тэматыкі. Аўтар змясціў пад адной вокладкай сцісла і разам з тым шматаспектны агляд праблемы. Гэткая навукова-папулярная кніга можа спрычыніцца да запрэзентавання вобразу Беларусі часоў нямецкай акупацыі і тым самым паспрыяць пачат-

[13] Гл. укладку са здымкамі ў кнізе Ю. Туронка, *Беларусь пад нямецкай акурацыяй*, Мінск 1993.

ку разумення дадзенай праблемы не праз прызму савецкай гістрыяграфіі. Разам з тым, на наш погляд, без выпраўлення пэўных хібаў немагчыма разлічваць на тое, што пільная патрэба з'яўлення на расійскім кніжным рынку, хоць і навукова-папулярнай, але ўсебаковай узважанай сінтэзы гісторыі нямецкай акупацыі Беларусі і беларускага нацыянальнага руху падчас Другой сусветнай вайны, перастане быць актуальнай.

**Юры Грыбоўскі**
(Варшава)

KAMUNIKAT.org